


## Жартоўны аловак



— А цяпер некалькі слоў аб шляхах развіцця нашай эканомікі...



ТРАВЕНЬ 1991г. Nr.8 КОШТ 2р.

# БЕЛАРУСКІ DX ІНФАРМАТАР
# САМОТНІК

ВЫДАНЬНЕ ІНФАРМАЦЫЙНАГА АГЕНЦТВА "СМАГА"




RADIO STELLA INTERNATIONAL

STAN KISELYOV / ODESSA / REALISTIC DX 440

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1206.0 | 19.00 | Echo of Moscow,17/3,RR IS,ID,sked,nx | URS | 33553 |
| 3270.0 | 18.30 | NBC Namibia,3/3,soft mx,lady talks | NMB | 33533 |
| 3356.0 | 20.15 | R.Botswana,3/3,Vn,nx ment.rebels,RSA etc. | BOT | 33433 |
| 4901.0 | 16.05 | SLBC,Sri Lanka,7/3,EE,gov't info | CLN | 43543 |
| 4935.0 | 17.30 | KBC,Nairobi,13/3,afro-pop,ID,short talk | KEN | 44533 |
| 4940.0 | 04.07 | R.Continental,11/3,ID,info on fqs,ad | VEN | 35433 |
| 4970.0 | 02.30 | R.Rumbos,Caracas,2/3,sports rpt,fast talk SS | VEN | 33543 |
| 4980.0 | 23.00 | R.Ecos del Torbes,17/3,LA mx,ID,sked | VEN | 35543 |
| 4985.0 | 03.35 | R.Brasil Central,13/3,educ.px,ment.SIDA | B | 34533 |
| 5015.0 | 04.00 | R.Vladivostok,7/3,local nx,tk on free trade | URS | 35533 |
| 5025.0 | 05.00 | R.Parakou,13/3,ID,s.on,FF,sked,'Hello,Africa' | BEN | 35433 |
| 5035.0 | 23.30 | R.Aparecida,13/3,IS('Jingle Bells'),ID | B | 43543 |
| 5055.0 | 04.05 | Faro del Caribe,13/3,SS,slow mx,ID | CTR | 33543 |
| 5056.0 | 04.40 | RFO Cayenne,FF,RFI TOP-15 | GUF | 44533 |
| 5065.0 | 03.35 | R.Shalkar,Alma-Ata,17/3,folk mx | URS | 43533 |
| 6165.0 | 03.45 | R.Perm,11/3,ID,tk on miners in RR | URS | 33543 |
| 6175.0 | 17.00 | R.Kiev,1/3,GG,sked,info block,nat. mx | URS | 35543 |
| 6305.0 | 08.00 | LV del CID,12/3,ID,slogans,nx SS | CLA | 35543 |
| 7370.0 | 07.00 | Turkiye Polis Radiosu,14/3,pop mx,brief info | TUR | 45544 |
| 7370.0 | 18.30 | R.Minsk,2/3,GG News,comm.,talk on prices | URS | 45544 |
| 7435.0 | 01.10 | WWCR,Nashville,1/3,sermon,Gospel mx | USA | 35533 |
| 7510.0 | 03.40 | KTBN,1/3,Gospel songs,talk in EE on Easter | USA | 35533 |
| 11850.0 | 15.00 | FEBC,Manila,1/3,EE ID,sked,mx spot,health tk | PHL | 32542 |
| 13710.0 | 15.30 | VO Europe,Pordenone,12/3,II,ID,a-ha song | I | 35533 |
| 13720.0 | 17.35 | KSDA,Guam,31/3,EE Africa,'It Is Written'/new | GUM | 35543 |
| 13720.0 | 13.00 | KSDA,Guam,31/3,RR new service,Moscow studio | GUM | 25422 |
| 15030.0 | 22.20 | R.For Peace Int'l,6/3,EE talk on religion | CTR | 33533 |
| 15200.0 | 20.00 | R.Kazan via tx in Perm,12/3,local nx RR | URS | 25533 |
| 15265.0 | 18.05 | Radiobras,22/3,EE Eur,nx | B | 33543 |
| 15355.0 | 19.30 | NHK Tokyo/via Gabon,7/3,RR,nx,comm | J | 45544 |
| 25750.0 | 07.45 | R.Australia,7/3,EE mx px, charts//new fq | AUS | 45544 |





# ПАД ЗНАКАМ ПАГОНІ

## БЕАРУСКАЕ СЛОВА НА ХВАЛЯХ РАДЫЕ БЕЛАСТОК

Кожны, хто хоць раз слухаў у пятніцу беларускамоўную перадачу Беластоцкага радыё, ведае, што ў гэты дзень ейныя рэдактары знаёміць слухача са зместам новага выпуску „Нівы" — радыёрубрыка „Чым варта пацікавіцца ў сённяшняй „Ніве". Няглядзячы на гэтую дармовую рэкламу, наш тыднёвік у сваіх публікацыях адводзіць перадачам „Пад знакам Пагоні" непараўнальна менш увагі. Жаданне прынамсі крышачку выраўнаць гэткую дыспрапорцыю ва ўзаемнай падтрымцы падштурхнула мяне, каб напісаць пару радкоў пра працу рэдактараў беларускіх перадач.

Аднаго разу я зайшоў у беларускую рэдакцыю, што памяшчаецца ў сядзібе Беластоцкага радыёвяшчання пры вуліцы Свярковай. Невялікі пакойчык, два пісьмовыя сталы, адзін мантажны. Мастацкае бязладдзе характэрнае для навалы працы. Кніжкі, кучы папераў з запіскамі ды кіламетры магнітафоннай стужкі. За мантажным сталом Юрка Ляшчынскі — рэжа і склейвае ў нескančонасць нейкую стужку, выпраўляючы моўныя хібы свайго размоўніка. Выкінуў якраз адно „Ыыы..." даўжынёю ў сантыметраў сорак.

— Шмат стужкі траціцца, — адзначаю.

— Ты не чуў Яновіча. У яго падобнае метрамі мерыцца.

У рэдакцыю ўрываецца Станіслаў Пазнанскі. Без лішніх уводзінаў страшыць мяне, што скасуе „ніўскую" рубрыку ў пятніцу, калі тыднёвік не пачне адзначаць такіх фактаў, як першае месца беластоцкіх радыёжурналістаў у агульнапольскім конкурсе на рэпартаж. Падумаўшы адну хвіліну, вырашаю змяніць мэту свайго візіту. Я зайшоў у радыё, бо Юрка хацеў узяць інтэрв'ю з рэдактарам-пачаткоўцам, гэта значыць са мною. Бяру лісток паперы і пераходжу ў наступленне.

Колькі слоў пра рэпартаж *Przypowieść o Świętej Górze*, калі ласка.

I і III каналы агульнапольскага радыёвяшчання абвясцілі былі конкурс на рэпартаж



## ГАСЬЦЕЎНЯ

пад заклікам *Przyszłość jest to dziś*. З Беластока паехаў на гэты конкурс рэпартаж *Przypowieść o Świętej Górze*. Здабыў ён першае месца. Ягоныя аўтары, як узнагароду, атрымалі чэк на адпаведную суму. Гэта столькі, калі глядзець на справу з яе фармальнага боку.

Гукарэжысёрам *Przypowieści* быў галоўны інжынер Беластоцкага радыё Томаш Петшыкоўскі. У аўтары рэпартажу трэба ўлічыць і польскага кампазітара Кшыштофа Пэндэрэцкага, бо фрагменты ягонай „Ютрані“ былі выкарыстаны як фон для цэлай аповесці.

Пры нагодзе гэтага поспеху беластоцкіх радыёжурналістаў варта адзначыць, што невыпадковы ён. Да гэтага часу высокія ўзнагароды ў падобных конкурсах здабывалі ўжо Анджэй Данільчук, Кшыштоф Кур'япок, Станіслаў Пазнанскі, Ян Смык (22 разы!), Барбара Цірук і іншыя. У асяроддзі польскіх радыёжурналістаў прытарнаваўся погляд, што Беласток гэта самая лепшая і цвёрдая школа рэпартажу.

Колькі слоў пра беларускамоўныя перадачы „Пад знакам Пагоні“. Першая перадача на беларускай мове, як успамінае *Беларускім календары 1978* Мацей Канапацкі, прагучала 13 чэрвеня 1958 года. Значыць, гісторыя беларускага слова на хвалях Беластоцкага радыё ўсяго на два гады каротшая за „ніўскую“. Штодзённыя перадачы „Пад знакам Пагоні“ пайшлі ў эфір ад 1 сакавіка 1990. Дамагліся іх дзеячы беларускай культуры пры падтрымцы дваццаці тысяч подпісаў пад петыцыяй. Сама магчымасць штодзённых перадач, як аказваецца, існавала ўжо на два месяцы да першага выпуску, але не дазволілі яе ажыццявіць вонкавыя акалічнасці. І, відаць, толькі вызваленне Юркі Ляшчынскага з кіпцюроў заходніх падрыўных радыёстанцый і ўсталяванне яго ў Беластоку надало справе колькасны і якасны ход. Рэдагаваннем перадач займаюцца сягоння тры штатныя рэдактары: Станіслаў Пазнанскі, Уладзіслаў Праховіч і Юрка Ляшчынскі — тыя самыя, якія склалі палову калектыву, што працаваў дзеля поспеху рэпартажу *Przypowieść o Świętej Górze*.

На заканчэнне яшчэ гадзіны перадач „Пад знакам Пагоні“:

— панядзелак — пятніца: 8.30—8.45; 18.45—19.00 (паўтарэнне),

— субота: 8.30—8.45 — Духоўныя сустрэчы; 18.45—19.00 — Канцэрт пажаданняў,

— нядзеля: 8.00—8.30.

**Аляксандр Максімюк**





## Ё-ГО-ГО Й ПЛЯШКА РОМУ

### ПРЫЯЦЕЛІ ХУТЧЭЙ РАЗВАРОЧВАЙ АНТЭНУ

==== PIRATE TIPS ====

Compiled by Vasil Rashkevich

"Free Radio" via "Samotnik" Box 213 Miensk 220107 Byelorussia

1600 - 1630 kHz

| Date | UTC | Station | ITU | Details | SINPO |
|---|---|---|---|---|---|
| 29.04.91. | 00.56 | R.Azimut | Pskov | WKD with R.Vasilok. | 55444 |
| | 01.19 | R.Armatura | Smolensk | CQ,WKD with R.Caravan | 33423 |
| | 01.33 | R.Caravan | Kursk | speak in whisper(!?) | 44444 |
| | 02.34 | R.Caskade | Belgorod | CQ...HRD,LID. | 34433 |
| | 21.00 | R.Karandash | Moscow | CQ,AUD,ADV,WKD with: | 55455 |
| | | | | R.Spartak Penza | ----3 |
| | | | | R.Batareja ??? | ----3 |
| | | | | R.Kolobok Belgorod | ----4 |
| | | | | R.Advocate ??? | ----2 |
| | | | | R.Skripach ??? | ----2 |
| | 21.18 | R.Partizan | Moscow(?) | Trix, talk,AUD,ADV | 45344 |
| | 21.32 | R.Azimut | Pskov | CQ,WKD with R.Izum.ud | 33222 |
| | 22.05 | R.Groza | Moscow | CQ,ADV,WKD with: | 43333 |
| | | | | R.Prostor ??? | ----2 |
| | | | | R.Zveroboy ??? | ----2 |
| | | | | R.Instruktor ??? | ----2 |
| | 22.27 | R.Zemlia | Moscow | WKD with R.Kachegar, Ant.- 37m.,CONDX. | 32433 |
| 30.04.91. | 21.22 | R."13" | ??? | CQ...,AUD,WKD with: | 33333 |
| | | | | R.Zveroboy ??? | ----2 |
| | | | | R.Prostor ??? | ----2 |
| 01.05.91. | 22.39 | R.Udacha | Novgorod | talk about device, pop mx. | 55545 |
| | 23.19 | R.Vysota | Orel | AUD,WKD with: | 33443 |
| | | | | R.Vertikal Chekhov | ----2 |
| | | | | R.Starshina 3 region. | ----2 |
| 02.05.91. | 00.50 | R.Mukhomor | Voronezh | CQ...,CONDX. | 34433 |
| 03.05.91. | 21.12 | R.Uragan | Kirovograd | talk about modulation | 44344 |
| | 21.28 | R.Budilnik | Tambov | CQ...,PPGN is TBL. | 43233 |
| | 21.36 | R.Udacha | Novgorod | HI talk,PPGN. | 45344 |
| | 21.50 | R.Proba | Tambov | WX talk,ANT,TNX. | 35433 |
| | 21.58 | R.Udarnik | 5 region | CQ... | 33333 |

## RADIO STELLA INTERNATIONAL

* The station began operation in 1979 under the name 'Thistle Radio' on 7315 KHz with approximately 20 watts and was subsequently renamed RSI to avoid confusion with Radio Crystal amongst foreign listeners.

** A setback occurred in 1980 when station staff were mistaken for poachers during an 'outside broadcast', causing a police raid, during which the investigating officers concluded that radio waves were the only things being fired into the surroundings, and after notes were taken, so was the equipment!

*** Thereafter only sporadic broadcasts were made until the summer of 1987 saw the purchase of more powerful apparatus and the introduction of increased programming mainly on the 48 metre band.

**** Stella transmits most Sundays between midnight and 0600 hours local time on 6320 KHz resulting in loggings from N. America, Africa, Russia, Scandinavia and many European Countries (not forgetting International Waters)! The present 48 metre band outlet is under constant review by extensive monitoring during the hours of darkness to check the clarity of the channel in use.

самотнік
Е-ГО-ГО И ПЛЯШКА РОМУ
samotnik

**
*** RSI is a Scottish free radio station whose programmes are compiled in Edinburgh but broadcast via our own transmitter from Ireland (for security reasons). The format consists of a popular music service mainly in the 'oldies' vein combined with listeners' requests and free radio DX information/recordings.

***
*** Transmitting equipment is primarily 'home-brew' and emits approx 200 watts through a horizontal half wave dipole whilst the studio gear includes twin turntables, audio cassette recorders, external amplifier, crystal mike and monitor speakers.

***
**** Communications from listeners whether new or established are always very much appreciated and will receive prompt attention. Your support reflects the station's success on which depends the survival of free radio!
73's, Good DX and FFFR.

Thanking you for your report

73's

Jock Wilson

Jock Wilson
RSI
23 South Beechwood
EDINBURGH 12
Scotland



самотнік
Е-ГО-ГО И ПЛЯШКА РОМУ
samotnik

# LISTENING IN FINLAND

Relays of the YLE external service in the capital region on

## 103.7 MHz FM/VHF HELSINKI

All times here in local time. Helsinki is two hours ahead of London, one hour ahead of Paris and Berlin.

| ENGLISH: | GERMAN: |
|---|---|
| 07.30-07.45 | 08.25-08.40 |
| 09.30-09.45 | 13.00-13.30 |
| 11.00-11.55 | 18.30-19.00 |
| 14.00-14.25 (Mon-Fri) | 22.25-23.00 |
| 15.00-15.25 (Mon-Fri) | 01.30-02.00 |
| 16.00-16.25 (Mon-Fri) | |
| 16.00-16.45 (Sat-Sun) | **FRENCH:** |
| 17.00-17.30 | 09.45-10.00 (Sun 09.40-09.55) |
| 21.30-22.00 | 13.30-13.45 |
| 24.00-00.25 | 23.45-24.00 |
| 02.00-02.25 | 02.25-02.40 |

ROUNDUP IN LATIN (5 min.): Mon 14.10, 15.20
Sat 09.40, 11.20, 11.50, 17.20
Sun 16.40, 21.50, 00.20, 02.20

Throughout Finland the YLE Third FM Network offers news in English daily at 9.55 pm and in German at 10.55 pm.

## YOUR DAILY CONTACT WITH FINLAND

Your radio and this leaflet is all you need for daily radio porgrammes from Finland worldwide. Your radio must have shortwave bands, preferably from 13 metres to 49 metres (21 MHz...6 MHz). In Northern Europe we are on the AM dial as well. The broadcast times are in Greenwich Time, in the Americas in EST (New York).
Listeners can write to Radio Finland, Box 10, 00241 Helsinki, Finland - or to Radio Finland, Box 462, Windsor CT, 06095 USA. Worldwide audience feedback phone (international access +) 1-203-688-5540.

"САМОТНІК"





## паштовая скрынка 213

Шановні друзі. Сподіваюсь, що інформация, яку я надсилаю до "Самотніка", буде Вам корисна.

Станіславу Кісялёву, п/с 7, Адэса 270100, Украіна

- Інфармацыя сапраўды карысная, таму зьмяшчаем яе цалкам. Са свайго боку выказваем надзею й найдалей атрымліваць, ад вас Станіслаў, DX-паведамленьні, якія адразу пойдуць ў нумар.

Атрымаў адзін з асобнікаў вашага інфарматара цераз стольны горад Ватыкан ад пана Тамушанскага. Зь цікавасьцю й інтарэсам прачытаў, што у Менску вельмі актыўныя ня толькі РАДЫЕізатопы ды нуклыіды, але і РАДЫЕаматары дыэксісты. Аб'ём бюлеценя бязумоўна невялікі, аднак гумару хапае...

Ігарсу Круміньшу, вул. Калнцыема 1-41, Рыга 226048, Латвія

- Прыемна даведацца, што наш голас чуваць і ў Ватыкане й Рызе. Мы ўдзячныя за пранікнёныя,шчырыя словы. Яны дапамагаюць нам у выпрабаваньнях на трывучасьць ад забруджваньня нашае старонцы нуклідамі духоўнага й нацыянальнага нігілізму. Сапраўды, адзінае, што за гады перабудовы ў нас засталося, гэта ксэракс і гумар.

...27.04.91 состоялся маленький съезд DX-ers Москвы и Подмосковья. Перезнакомились. Решений не принимали, встречных планов тоже. Короче всё на уровне.

Альберту Грабарэнку, вул. Маскоўская 14-6, Дубна 141980.

- Каму як, а нам добра вядома, што уяўляюць зь сябе гэткія "маленькія з'езды", праўда раней яны зваліся крыху інакш... Зараз, каб быць "на узроўні" адных грошай яўна нядастаткова. Але ж у нас падобныя "з'езды" адбываюцца амаль кожную палучку...

...маю намер стварыць у райцэнтры прыватную фірму, каб прымаць спадарожнікавае ТБ, весьці ўласнае, інфармацыйнае, эфірнае вяшчаньне, абуджаць сьвядомасьць людзей.

Леаніду Леўтаву, п/с 21,ГАС-3 Гарадок 211540 Вітэбская вобл.

- Слушны намер.Калі б кожны на Беларусі меў прыватную краму, фірму ці зямлю, дык жыў бы ўжо бадай як на тым "загніваючым Захадзе".

## СПАДАРОЖНІКАВАЕ РАДЫЁВЯШЧАНЬНЕ






# Voice of America

## Popmusik und Informationen rund um die Uhr

via EUTELSAT I-F1 auf 13 Grad Ost (beim TV-Programm SAT 1) Tonfrequenzen: 7.02 & 7.20 mHz

| Montags | Dienstags | Mittwochs | Donnerstags | Freitags | Samstags | Sonntags |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 05.30 VOA Morning | 05.30 VOA Morning | 05.30 VOA Morning | 05.30 VOA Morning | 05.30 VOA Morning | 05.10 VOA Saturday Morning | 08.10 VOA Sunday Morning |
| 06.10 Jeff Roberts Show | 06.10 Jeff Roberts Show | 06.10 Jeff Roberts Show | 06.10 Jeff Roberts Show | 06.10 Jeff Roberts Show | 06.10 Jeff Roberts Show | 10.10 American Top 40 |
| 10.10 Eric Phillips Show | 10.10 Eric Phillips Show | 10.10 Eric Phillips Show | 10.10 Eric Phillips Show | 10.10 Eric Phillips Show | 10.10 Eric Phillips Show | 14.10 American Country Countdown |
| 13.10 Newsline | 13.10 Newsline | 13.10 Newsline | 13.10 Newsline | 13.10 Newsline | 13.10 Weekend | 18.10 Focus |
| 13.30 Eric Phillips Show | 13.30 Eric Phillips Show | 13.30 Eric Phillips Show | 13.30 Eric Phillips Show | 13.30 Eric Phillips Show | 14.10 American Top 40 | 18.30 Press Conference, U.S.A. |
| 14.10 Carol Parker Show | 14.10 Carol Parker Show | 14.10 Carol Parker Show | 14.10 Carol Parker Show | 14.10 Carol Parker Show | 18.10 Rock'n'Roll Never Forgets | 19.10 Encounter |
| 18.10 Music Special | 18.10 Music Special | 18.10 Music Special | 18.10 Music Special | 18.10 Music Special | 20.10 Dance Trax | 20.30 Studio One |
| 19.10 Jim Bertel Show | 19.10 Jim Bertel Show | 19.10 Jim Bertel Show | 19.10 Jim Bertel Show | 19.10 National Music Survey | 23.10 Willis Conover's House of Sounds | 21.10 Jim Bertel Show |
| 22.10 VOA-Europe Evening Report | 22.10 VOA-Europe Evening Report | 22.10 VOA-Europe Evening Report | 22.10 VOA-Europe Evening Report | 22.10 VOA-Europe Evening Report | 00.10 Music Special | 23.10 Willis Conover's House of Sounds |
| 23.10 Willis Conover's House of Sounds | 23.10 Willis Conover's House of Sounds | 23.10 Willis Conover's House of Sounds | 23.10 Willis Conover's House of Sounds | 23.10 Willis Conover's House of Sounds | 01.10 National Music Survey | 00.10 Lee Arnold Show |
| 00.10 Music Special | 00.10 Music Special | 00.10 Music Special | 00.10 Music Special | 00.10 Music Special | 04.10 Music Special | 03.10 Music Special |
| 01.10 Jim Bertel Show | 01.10 Jim Bertel Show | 01.10 Jim Bertel Show | 01.10 Jim Bertel Show | 01.10 National Music Survey | | |
| 05.10 Newsline | 05.10 Newsline | 05.10 Newsline | 05.10 Newsline | 05.10 Newsline | | |





# АНТЭННЫ УЗМАЦНЯЛЬНІК УКХ-ЧМ-1

У дзесяці гарадах Беларускай ССР працуюць радыёвяшчальныя перадаючыя станцыі, якія рэтранслююць стэрэафанічныя праграмы. Шматлікія радыёслухачы набываюць дарагую радыёапаратуру (цюнеры, радыёмагнітолы, стэрэапрыёмнікі) для прыёму стэрэаперадач.

Зона ўпэўненага прыёму звычайнай радыёперадаючай станцыі на УКХ не перавышае 50 км. На большай адлегласці ўладальнік не можа выкарыстаць выдатныя параметры набытай каштоўнай радыёапаратуры без дадатковых сродкаў.

Каэфіцыент узмацнення АУ-УКХ-ЧМ-1 на адным транзістары тыпу КП350А— 20 дэцыбелаў (10 разоў па напружанні).

Узмацняльнік разлічаны толькі на паласу частот, у якой вядзецца радыёвяшчанне на УКХ. Гэта практычна азначае, што на ўзроўні 0,7 амплітудна - частотнай характарыстыкі паласа прапускання ўзмацняльніка знаходзіцца ў межах 8,0 МГц. Таму перашкоды ад тэлевізійных перадатчыкаў другога або трэцяга каналаў, паміж частотнымі спектрамі якіх перадаецца радыёвяшчанне на УКХ, значна паслабляюцца. Гэта вельмі спрыяе якаснаму прыёму стэрэаперадач, калі ў данай мясцовасці працуюць тэлевізійныя перадатчыкі другога або трэцяга каналаў.

Уваход і выхад узмацняльніка разлічаны на падключэнне кааксіяльнага кабелю з хвалевым супраціўленнем 75 Ом. Выкарыстоўванне экраніраванага кабелю не дазваляе пранікнуць перашкодам у тракт радыёпрыёмніка праз фідэр (кабель зніжэння).

Сілкаванне ўзмацняльніка ажыццяўляецца ад крыніцы пастаяннага току напружаннем не болей +10 В. (гэта могуць быць дзве паслядоўна ўключаныя «плоскія» батарэйкі). «Мінус» крыніцы сілкавання падключаецца да корпусу ўзмацняльніка. Можна выкарыстоўваць прамысловыя блокі сілкавання, напрыклад БП-9/60 (для сілкавання радыёпрыёмнікаў «ВЭФ» ад электрасеткі; цана — 7 руб. 50 кап.) або ПУ-ІМ (цана—12 руб.).



Кандэнсатары C1, C2, C6, C7 — гэта малагабарытныя падстроечныя кандэнсатары тыпу КПК-М-4/15 (межы змянення ёмістасці ад 4-х да 15-ці пікафарад). Кандэнсатары C3, C4 і C5 тыпу МК і іх ёмістасць можа быць у межах ад 4700 да 6800 пФ.

Рэзістары R2, R3, R4 любога тыпу на магутнасць 0,125 або 0,25 Вт. Падстроечны малагабарытны рэзістар R1 тыпу СПЗ-16.

Дросель Др1 тыпу ДМ-0,1 або любы іншы высокачастотны дросель з індуктыўнасцю не меней 40 мікрагенры.

Дыёд Д1 (прызначаны для аховы транзістара T1 ад няправільнага ўключэння напружання сілкавання) можа быць любога тыпу, які вытрымлівае ад электрычнага прабою напружанне не меней 10 В.

Шпулі індуктыўнасці L1... L4 бескаркасныя. Яны намотваюцца на шпіні дыяметрам 10 мм, які затым выдаляецца з канструкцыі шпулі. Для вырабу шпуль пажадана выкарыстоўваць пасярэбраны провад дыяметрам 1 мм. Калі такога проваду ў радыёаматара няма, то можна выкарыстоўваць голы медны провад такога ж дыяметру. Крок намоткі шпулі 1,0... 1,5 мм. Колькасць віткоў у шпулях L1 і L4—дзесяць, а ў шпулях L2 і L3—дзевяць.

На антэнны ўваход A ад шпулі L1 робіцца адвод ад другога па схеме вітка знізу. Таксама ад другога вітка знізу робіцца адвод на першы затвор 31 транзістара T1. Са стоку C гэтага транзістара робіцца адвод на другі знізу віток шпулі L3. Выхад узмацняльніка падключаецца да другога знізу вітка шпулі L4.

Калі радыёаматары не змогуць набыць транзістар КП350А або КП350Б, то ў данай электрычнай схеме можна выкарыстоўваць транзістары тыпу КП306А або КП306Б. Пры выкарыстоўванні гэтых транзістараў трэба супраціўленне рэзістара R2 павялічыць са 100 да 180 кОм.

Пасля заканчэння мантажу і зборкі АУ-УКХ-ЧМ-І трэба вывесці рухавічок падстроечнага рэзістара R1 да мінімуму. Пасля гэтага трэба падключыць крыніцу сілкавання +9 В. На прынцыповай схеме крыжыкам азначана месца, у разрыў якога патрэбна ўключыць мікраамперметр. Уводзячы рухавічок рэзістара R1, трэба ўстанавіць ток стока транзістара T1 у сярэднім 12 мА. Далей з дапамогай прыбора Х1-19А (або Х1-9Б, Х1-30) трэба прыступіць да звычайнай адладкі ўзмацняльніка. Пры гэтым трэба дабіцца найбольшага ўзмацнення ў паласе частот 66... 73 МГц.



# "Беларускі Rock'n'Roll інфарматар"

## Информационное агентство "Смага"

при минском молодежном центре "Компланар" начало издавать ежемесячный журнал "Беларускі Rock'n'Roll інфарматар". В нем будет публиковаться лаконичная информация о событиях в мире рок-музыки, краткие обзоры новых пластинок, переводы популярных песен из классики рока на белорусский язык.

Агентство "Смага" берется не только сообщать меломанам свежие новости, но и поможет пополнить коллекцию фонограмм новыми записями, используя высококачественную зарубежную аппаратуру, причем по ценам всего 6 копеек за минуту, что на 30 процентов ниже государственных и на 14 — большинства кооперативных. Планируется оперативно информировать читателей о всех новых поступлениях фонограмм в студию молодежного центра. Учитывая скромные возможности нового издания и небольшой тираж, журнал пока можно приобрести лишь в студии звукозаписи МЦ "Компланар".

Игорь ГУКОВСКИЙ

Радыё «Свабода»
Беларуская праграма
штодня а гадзіне 5.00—5.30 на хвалях 31,41,49,75 м.
7.00—8.30 25,31,41 м.
17.00—18.00 19,25,31,41 м.
20.00—21.00 19,25,31,41 м.
Адрас для карэспандэнцыі:
Postfach 221425,
D-8000 Muenchen, Germany—Нямеччына

Выдавец: Інфармацыйнае Агенцтва "Смага"
Рэдактар Валеры Пятухоў
Тэлефон -(0172) 45-55-94
Рэдакцыйная рада: М.Віцер І.Міхайлаў, А.Лінкін.
Адрас рэдакцыі: Беларусь 220107 Менск-107 п/с 213
Тэлефон: (0172) 26-09-04
Наклад 150 асобнікаў.
Кошт 2 рублі ці 4 IRS's
Выходзіць раз на месяц
При перадрукоўцы матэрыялаў рабіце спасылку на "САМОТНІК"
"The Anchoret" Byelorussian DX-monitor
Produced by Thirst News Association Ltd.